Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 238 (307)
НЯДЗЕЛЯ
13
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб дні выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР

1. Назначыць выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР на 15 снежня 1940 года.

2. Аб'явіць пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у гэтых абласцях з 15 кастрычніка 1940 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

12 кастрычніка 1940 г., г. Мінск.

СІСТЭМАТЫЧНА ПРАВЯРАЦЬ ВЫКАНАННЕ ПАРТЫЙНЫХ РАШЭННЯЎ

Ленін і Сталін на працягу ўсёй гісторыі нашай партыі вучылі комуністаў арганізаванасці і дысцыпліне. У вядомай кнізе «Крок уперад, два крокі назад» Владзімір Ільіч пераканаўча даказваў аб неабходнасці навучыцца патрабаваць выканання абавязкаў члена партыі не толькі ад радавых, але і ад «людзей верху». Не раз падкрэсліваў значэнне праверкі выканання таварыш Сталін. У справаздачным дакладзе XVII з'езду партыі таварыш Сталін гаварыў:

«Ці працуе апарат чэсна і пабольшэвіцку або круціцца на халастым ходу, — аб усім гэтым можна даведацца своечасова толькі ў выніку добра пастаўленай праверкі выканання. Добра пастаўленая праверка выканання — гэта той пражэктар, які дапамагае асвятляць стан работы апарата ў любы час... Можна з упэўненасцю сказаць, што дзевяць дзесятых нашых прарэхаў і прарываў тлумачыцца адсутнасцю правільна пастаўленай праверкі выканання». І далей таварыш Сталін звяртаў увагу з'езда на тое, каб «... праверка выканання была сістэматычная, ...каб на чале справы праверкі выканання ва ўсіх звеннях партыйна-совецкіх і гаспадарчых арганізацый сталі не другарадныя асобы, а дастаткова аўтарытэтныя людзі, — самі кіраўнікі арганізацыі».

Следуючы ўказанням ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна, XVIII з'езд КП(б)Б абавязаў усе абкомы, гаркомы і райкомы партыі Беларускай ССР «... арганізаваць праверку выканання так, каб яна папярэджвала і забяспечвала своечасовае выкананне ўсіх дырэктыў партыі і ўрада».

Важнасць і значэнне праверкі выканання ясны для кожнага большэвіка. Аднак, не гледзячы на гэта, праверка выканання ў большасці партыйных арганізацый нашай області яшчэ не пастаўлена на належную вышыню. Вынікі абследвання раду партыйных арганізацый, якое нядаўна праведзена брыгадай камісіі партыйнага кантролю, пераканаўча паказалі, што ў нашай області ўказанні XVIII з'езда КП(б)Б выконваюцца выключна слаба, што праверка выканання ў многіх партарганізацыях праводзіцца не сістэматычна і не сур'ёзна.

У Беластоцкім, Гродненскім, Ваўкавыскім і іншых гаркомах і райкомах партыйныя рашэнні правяраліся рэдка і павярхоўна, а вельмі часта не правяраліся зусім. У Беластоцкім гаркоме не праверана і 20 процантаў прынятых рашэнняў. У Гродненскім гаркоме за гэты-ж тэрмін з 69 прынятых рашэнняў праверана выкананне толькі двух рашэнняў.

Не лепшае становішча і ў пярвічных партарганізацыях. Не наладжана, напрыклад, праверка выканання рашэнняў партсходаў і вышэйстаячых партыйных органаў у пярвічнай арганізацыі цэментнага завода (Ваўкавыскі раён). Дрэнна займаюцца гэтым пытаннем на 3-ім беластоцкім тэкстыльным камбінаце. Партыйная арганізацыя пятага тэкстыльнага камбіната з 10 сваіх-жа ўласных пастаноў праверыла выкананне толькі трох. У сувязі з адсутнасцю праверкі ў гэтай арганізацыі рад пастаноў асталіся невыкананымі. 28 мая партсход прыняў рашэнне аб тым, каб дабіцца хуткага і поўнага пераходу будаўнічых работ на здзельшчыну. Добрае, каштоўнае рашэнне! У парадку партыйнага кантролю над дзейнасцю адміністрацыі яно павінна было прынесці нямалую карысць. Але рашэнне гэта да апошніх дзён далёка не выканана. З 130 будаўнічых рабочых на здзельшчыну пераведзена ўсяго 60 чалавек. Нясвоечасова і не поўнасцю выканана пастанова аб дапамозе кіраўніцтву камбіната ў пуску капялюшавай фабрыкі.

Днямі наша газета паведамляла на сваіх старонках аб іншых падобных фактах. У пярвічнай партыйнай арганізацыі Аўгустоўскага райвыканкома, з-за адсутнасці праверкі выканання, важнейшыя пункты пастановы справаздачна-выбарчага схода асталіся нявыкананымі.

На недахопы ў нашай абласной партыйнай арганізацыі па праверцы выканання ўказваў ЦК КП(б)Б. Канкрэтнае рашэнне па гэтаму пытанню прынята бюро абкома партыі. Гарадскія і раённыя камітэты партыі павінны да пытання праверкі выканання аднесціся з усёй сур'ёзнасцю. Кіраўнікі ўсіх партыйных арганізацый нашай області абавязаны наладзіць кантроль за выкананнем усіх партыйных рашэнняў у самы кароткі тэрмін. На канкрэтных справах яны павінны вучыць большэвіцкаму стылю кіраўніцтва работнікаў совецкіх і гаспадарчых устаноў. Шляхам штодзённай праверкі выканання партыйныя кіраўнікі павінны лепш разгарнуць барацьбу за новыя поспехі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, за выкананне Ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня 1940 года.

Зараз у гарадах і раёнах нашай області пачынаюцца справаздачныя партыйныя сходы пярвічных арганізацый. На гэтых сходах неабходна шырока разгарнуць большэвіцкую крытыку і самакрытыку недахопаў, у першую чаргу крытыку недахопаў па пастаноўцы праверкі выканання. Справаздачныя сходы павінны прайсці пад знакам усебаковай праверкі таго, як выкананы рашэнні справаздачна-выбарчых сходаў, як выконваюцца рашэнні ўсіх партыйных сходаў і ўказанні вышэйстаячых партыйных органаў, як выконваюцца рашэнні XVIII з'езда КП(б)Б.

З усёй сур'ёзнасцю ставячы пытанне аб сістэматычнай праверцы выканання, гаркомам і райкомам неабходна звярнуць вялікую ўвагу на распаўсюджванне лепшага вопыту партыйнай работы. Трэба, у прыватнасці, пашыраць і каштоўны вопыт тых арганізацый, якія добра наладзілі праверку выканання. А такі вопыт у нашай області, безумоўна, ёсць.

Партыйныя арганізацыі павінны цвёрда памятаць і няўхільна выконваць указанні Леніна і Сталіна аб праверцы выканання. Наладзіўшы сістэматычную праверку выканання ў партыйных, совецкіх, гаспадарчых, профсаюзных арганізацыях, беластоцкая абласная партыйная арганізацыя хутчэй і лепш выканае рашэнні XVIII з'езда КП(б)Б, хутчэй і лепш будзе ажыццяўляць усе ўказанні нашай вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Адкрыццё сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку

У 7 гадзін вечара ў Доме партыйнай асветы 12 кастрычніка адкрылася навуковая Сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная першай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі.

Вялікая зала Дома партыйнай асветы запоўнена прадстаўнікамі інтэлігенцыі і рабочых. Прысутнічаюць прадстаўнікі ад Брэсцкай і Вілейскай абласцей.

У прэзідыуме — Прэзідэнт Акадэміі навук БССР акадэмік Горэў, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук акадэмік Леонаў, акадэмікі Кедраў-Зіхман, Вальфсон, народныя паэты БССР — акадэмікі Янка Купала і Якуб Колас, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкі, сакратары абкома КП(б)Б тт. Ігаеў, Сямёнаў, Папоў і іншыя.

Пад бурныя апладысменты ўсяго зала прымаецца прапанова акадэміка тав. Леонава аб выбранні ў пачотны прэзідыум навуковай Сесіі членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з вялікім Сталіным.

Слова прадастаўляецца акадэміку Вальфсону для агалашэння прывітальнага пісьма таварышу Сталіну. Тэкст пісьма прымаецца аднагалосна.

Старшынствуючы акадэмік Леонаў прадастаўляе слова для даклада аб першай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі Прэзідэнту Акадэміі навук БССР акадэміку Горэву.

Тав. Горэў падрабязна спыняецца на пакутах, перанесеных беларускім народам пад гнётам польскіх памешчыкаў і капіталістаў. У верасні мінулага года Чырвоная Армія падала руку брацкай дапамогі. У прах развалілася польская дзяржава. Беларускі народ, штучна раздзелены, атрымаў магчымасць з'еднацца ў адзінай социялістычнай рэспубліцы — БССР. Год социялістычнага будаўніцтва ў спустошаных абласцях прынёс нябачаныя поспехі.

Акадэмік В. І. Пічэта на Сесіі прачытаў даклад «Барацьба беларускага народа за сваё вызваленне».

На працягу доўгай гісторыі беларускі народ гераічна змагаўся з ворагамі. Разам з украінскім і рускім народамі адстайваў ён сваю незалежнасць ад польскіх паноў. Як пратэст супроць прыгнёту, у XV—XVI стагоддзя беларускія сяляне беглі ад памешчыкаў ва ўсходнія області і асноўвалі там казацкія пасяленні.

Пасля уніі Літвы з Польшчай 1569 г. польскія землеўладальнікі ўстанавілі лютую дыктатуру. У 1573 г. быў выдан закон, па якому памешчык мог безадказна караць селяніна смерцю. У кожным маёнтку былі ўстаноўлены віселіцы. Але, калі сілай беларускі народ пакарыць не ўдавалася, польскія паны прыбягалі за дапамогай царквы. У 1596 годзе адбылася царкоўная ўнія, якую ўзяў пад сваё пакравіцельства Сігізмунд III. Унія павінна была быць сродкам апалячвання беларускага народа. Але беларускі народ дае гэтаму жорсткі адпор, і праз усю гісторыю праносіць сваю культуру, мову, сваю векавую мару быць незалежным. Гэта мара беларускага народа ажыццявілася год таму назад, воляй партыі большэвікоў, воляй вялікага Сталіна.

Сёння сесія працягвае сваю работу.

Выстаўка Акадэміі навук у Доме партасветы

Учора ў кабінеце гісторыі ВКП(б) беластоцкага Дома партыйнай асветы адкрылася выстаўка Акадэміі навук БССР. На выстаўцы прадстаўлены экспанаты і дыяграмы, расказваючыя аб роскввіце навукі і дасягненнях Беларусі за 23 годы.


У аддзеле інстытута социялістычнай сельскай гаспадаркі выстаўлены экспанаты ільну, ячменю, аўсу, жыта, вырашчаныя на вопытных участках у калгасе імені Сталіна, Магілеўскага раёна.

Вельмі цікавыя даныя інстытута геалогіі аб даследванні каштоўных выкапняў у недрах зямлі на тэрыторыі Беларусі. У 1919 годзе ніякіх даных аб заляганні каштоўнай сыравіны амаль не было. За годы совецкай улады навукова-даследчымі экспедыцыямі знойдзены залежы ў розных месцах сыравіны для вырабу грубай керамікі (цэглы, чарапіцы) колькасцю ў 86.029 тысяч тон, для вырабу звязваючых матэрыялаў (цэмент, вапна) 98.377 тысяч тон, многа сыравіны для шкляной прамысловасці. Гледачы з цікавасцю знаёмяцца з выстаўленай картай размяшчэння карысных выкапняў па раёнах.

Шырока паказаны рост здабычы торфу і скарыстання яго, выданне літаратуры, газет, рост сеткі школ і вышэйшых навучальных устаноў.

Цікавым з'яўляецца дыяграма аб бюджэце Акадэміі навук БССР. У 1930 годзе бюджэт Акадэміі навук БССР складаў яшчэ толькі 749 тысяч рублёў, а ў 1940 годзе ён складае 8.143 тысячы рублёў.

Дыяграмы шырока ілюстрыруюць дасягненні працоўных заходніх абласцей Беларусі, і ў прыватнасці, горада Беластока за год совецкай улады.



Стаханаўка-двухстаночніца 32-й беластоцкай вацінна-ватнай фабрыкі Г. Д. Бахрах, выконваючая норму на 150 процантаў.

Фота А. Сапіра.

Паступаю ў рамесленае вучылішча

Мой бацька — столяр. Не раз любаваўся я, як па-майстэрску ў яго руках ходзіць рубанак, як ён вырабляе добрыя сталярныя рэчы.

Прыглядаючыся да работы бацькі, я таксама рашыў стаць столярам. Школа ФЗВ у Гродне, у якой я вучыўся, зараз рэарганізуецца. Я, як і ўсе вучні нашай школы, з вялікай радасцю чытаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах і пастанову Соўнаркома аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў школы. Я паступаю ў рамесленае вучылішча. Зараз ужо ўмею вырабляць крэслы, столікі і іншыя сталярныя рэчы. Мне 15 год. У школе нам будуць створаны ўсе умовы, каб атрымаць высокую кваліфікацыю столяра. Акрамя гэтага я папоўню свае агульна-адукацыйныя веды.

Радзіма наша расце і багацее. Ёй патрэбны прыгожыя вагоны, будынкі, мэбля. А каб пабудаваць усё гэта, патрэбны рукі столяра. Я абавязуюся выдатна вучыцца і авалодаць сваёй справай, каб быць карысным радзіме.

Эля Урэцкі.

БУДУ СЛЕСАРАМ

Слесар — гэта пачотная спецыяльнасць. Прыемна бачыць, як з кавалкаў жалеза з-пад тваіх рук выходзяць дэталі для машын, варштатаў. Я даўно цікавіўся гэтай справай. Калі была арганізавана школа фабрычна-заводскага вучнёўства ў Гродне, я паступіў вучыцца на слесара.

Усе вучні нашай школы горача абмяркоўвалі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах. Мы даведаліся, што наша школа ФЗВ рэарганізуецца. Усе вучні поўны жадання паступіць у новую школу.

У рашэнні ўрада адлюстраваны бацькоўскія клопаты аб совецкай моладзі. Нам не патрэбна будзе, як нашым бацькам, па некалькі год быць на пабягушках у майстра. Мы будзем абучацца ў школе за кошт дзяржавы. З вялікай ахвотай я іду ў новую школу, каб авалодаць слесарнай справай. Выйду са школы выдатным слесарам, каб будаваць для сваёй любімай радзімы моцныя паравозы, танкі, самалёты і іншыя машыны.

Майсей Касоўскі.

Беласток--Алма-Ата

Тэлефонная размова прадстаўнікоў двух калгасаў

Вечарам, 11 кастрычніка, у сувязі з 20-годдзем Казахскай ССР і наблiжэннем 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі па ініцыятыве рэдакцый газет «Казахстанская правда» і «Вольная праца» адбылася гутарка па тэлефону прадстаўнікоў двух калгасаў. Ля тэлефоннага апарата рэдакцыі «Казахстанскай правды» у Алма-Ата быў сакратар пярвічнай партыйнай арганізацыі калгаса імені Сталіна, Куталінскага раёна, Алма-Ацінскай області, тав. Сцяпан Рарый. Ля тэлефоннага апарата рэдакцыі «Вольнай працы» у Беластоку знаходзілася старшыня калгаса імені Сталіна, Заблудаўскага раёна, Беластоцкай області, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Еўдакія Максімюк.

Ніжэй мы прыводзім змест адбыўшайся гутаркі.

Алма-Ата — тав. Рарый:

— Добры дзень, тав. Максімюк! Наша Казахская Совецкая Социялістычная Рэспубліка адзначае 20-годдзе свайго існавання. У гэтыя-ж дні Вы падводзіце вынікі першага года новага жыцця, новай калектыўнай працы.

Ад усёй душы віншую Вас з наблiжэннем 23-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Беласток — тав. Максімюк:

— Добры дзень, дарагія таварышы казахстанцы! Ад імені калгаснікаў Беластоцкай області віншую вас з святам — 20-годдзем Казахскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі!

Раскажыце, тав. Рарый, як Вы сустрэлі 20-гадовы юбілей Казахстана?

Алма-Ата — тав. Рарый:

— Рыхтуючыся да сённяшняга свята, наш калгас імені Сталіна прапанаваў пачаць социялістычнае спаборніцтва імені 20-годдзя Казахскай ССР. Наш заклік падхапілі ўсе калгаснікі Казахстана.

Калгаснікі нашай сельгасарцелі з поспехам выканалі ўзятыя на сябе социялістычныя абавязацельствы. Мы добра ўправіліся з уборкай ураджаю, паспяхова выканалі абавязкі перад дзяржавай. Пасля гэтага ў распараджэнні калгаса яшчэ асталося больш 20 тысяч цэнтнераў зярна. Такога ўраджаю, які сабран у гэтым годзе, не толькі ў нашым калгасе, але і наогул у калгасах Алма-Ацінскай області мы яшчэ ніколі не атрымоўвалі.

Асноўную частку даходаў аддаем на далейшае развіццё грамадскай гаспадаркі арцелі. Нямала размяркоўваем і на працадні. Кожны калгаснік атрымае на працадзень па 4 рублі 75 капеек грашыма, па 7,5 кілограмаў хлеба і многа іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.

Мінулы год для нашага калгаса быў выдатным. Зроблен новы крок у развіцці калгаснай гаспадаркі, у росце заможнасці калгаснікаў.

Вырасла і культура нашага сяла. У пачатку гэтага года ў нас было 79 непісьменных. Усё лета яны абучаліся. Зараз у калгасе няма ніводнага непісьменнага.

Святкаванне юбілею калгаснікі нашай арцелі сустрэлі з велізарнай радасцю. Гэта радасць надае нам яшчэ больш упэўненасці у тым, што мы ідзём па правільнаму шляху, што ўперадзе ў нас яшчэ больш светлае і шчаслівае жыццё.

Раскажыце нам, як у вас прайшоў першы год новага жыцця, якіх поспехаў вы дабіліся?

Беласток — тав. Максімюк.

Вельмі рада, што мне прадставілася магчымасць пагаварыць з Вамі па тэлефону. Карыстаючыся гэтым выпадкам, хачу расказаць Вам аб нашым новым жыцці пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, хачу расказаць, з чым мы сустракаем 23-ю гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі.

У верасні 1939 года слаўная Чырвоная Армія паклала канец нашаму гору, нашым пакутам. Яна вызваліла нас ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Прайшоў год. За гэты кароткі час мы дабіліся вялікіх поспехаў у перабудове свайго жыцця.

Следуючы прыкладу сялян усходніх абласцей, сяляне нашай вёскі ў студзені гэтага года арганізавалі калгас. Спачатку ў яго ўступіла 38 гаспадарак. Праз два тыдні да нас далучылася яшчэ 138 гаспадарак. Такім чынам, з 200 сем'яў у нашай вёсцы — 176 сталі калгаснікамі. Свайму калгасу мы далі імя вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

За прайшоўшыя дзевяць месяцаў наш калгас дабіўся нямалых поспехаў. Маючы дастатковую колькасць зямлі, мы занялі пад пасеў яравых культур 443 гектары, пад пасеў азімых 425 гектараў. Уборка ўраджаю праведзена ў сціслыя тэрміны. З дзяржавай па ўсіх відах паставак разлічыліся поўнасцю і своечасова.

Папярэднія вынікі першага года калгаснага жыцця пераканаўча гавораць аб тым, што мы ўжо зараз становімся заможнымі. На адзін працадзень кожны калгаснік атрымае па 11 кілограмаў і 200 грамаў зерневых і па 24 кілограмы бульбы. Сям'я былога батрака, а зараз старшага калгаснага конюха Сцяпана Чэшэля, атрымае на свае працадні 240 пудоў зярна і каля тысячы пудоў бульбы. Былыя батрачкі — зараз даяркі ў калгасе — Анастасія Нэвік і Анна Амандзей атрымаюць па 150 пудоў зярна.

Адначасова вядзем у калгасе вялікія будаўнічыя работы.

У корані змянілася жыццё ўсіх сялян нашай області. За год па області арганізавана 163 калгасы, у якія ўступілі звыш 7 тысяч бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак.

Такія нашы першыя вынікі. Яны, вядома, з'яўляюцца меншымі вашых поспехаў. Але мы пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ў другім годзе совецкай улады яшчэ хутчэй пойдзем уперад.

Навуковая сесія Акадэміі навук БССР у Беластоку

„За працвітанне навукі, той навукі, якая не адгароджваецца ад народа, не трымае сябе ўдалі ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваяванні навукі“. **І. СТАЛІН.**

Навуковая работа Акадэміі навук БССР

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь не мела ні адной навукова-даследчай установы, ні адной вышэйшай навучальнай установы. Таму дакастрычніцкі перыяд у і-сторыі нашай навукі з'яўляецца цёмнай плямай.

Навука ў БССР з'яўляецца дзецішчам Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Іменна ў Совецкай краіне яна стала дасягненнем народа і служыць народу, таму што яна стала справай дзяржаўнай, таму што навукай у нашай краіне кіруе Цэнтральны Камігэт нашай партыі і асабіста таварыш Сталін.

Якія-ж праблемы вырашаюць вучоныя Акадэміі навук БССР?

Беларускі народ мае сваю гераічную, поўную барацьбы за сваё вызваленне гісторыю. Ён мае і сваю выдатную гісторыю совецкага перыяда—гісторыю велізарнай творчай работы на ўсіх участках гаспадарчага і культурнага жыцця краіны. Гэтыя два этапы ў жыцці беларускага народа знайшлі сваё адлюстраванне і ў мастацкай літаратуры, і ў народнай творчасці. Гістарычная навука адстала ў гэтых адносінах, і вось беларускія гісторыкі Акадэміі навук і іншых устаноў працуюць над стварэннем зусім новай навукі—гісторыі Беларусі, а літаратуразнаўцы ўжо стварылі падручнік па гісторыі беларускай літаратуры, ахапіўшы яе з старажытных часоў да нашых дзён. Вялікая работа праароблена па складанню руска-беларускага слоўніка. Распрацоўваецца пытанне аб зменах у беларускім правапісе.

Эканамісты разам з геалогамі, харчавікамі і работнікамі сельскай гаспадаркі распрацоўваюць такія важныя пытанні, як размяшчэнне прадукцыйных сіл БССР і ўвядзенне правільных севаабаротаў у калгасах нашай рэспублікі. Гэтыя тэмы з'яўляюцца рэалізацыяй рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б). Распрацоўваецца вялікае пытанне аб стварэнні кармовай базы пры ўвядзенні правільных севаабаротаў у калгасах рэспублікі. Нарэшце, трэба адзначыць і вялікую заканчваемую работу па складанню Атласа БССР, які будзе з'яўляцца настольнай кнігай работнікаў усіх спецыяльнасцей і ўсякага культурнага чалавека.

У галіне сельскай гаспадаркі вучоныя Беларусі, працуючы над павышэннем ураджая і яго ўстойлівасцю, ужо распрацавалі рад спецыяльных метадаў штучнай апрацоўкі глеб і палепшання іх уласцівасцей. Рад навуковых станцый рэспублікі разам з Інстытутамі Сельскай гаспадаркі і Біялогіі Акадэміі навук распрацоўваюць метады, якія дазваляюць у травапольным севаабароце атрымаць высокія і ўстойлівыя ўраджаі канюшыны, цімафееўкі і іншых шматгадовых траў.

Адна з найбольш важных праблем—ператварэнне Палесся ў квітнеючы край. У гэтым напрамку ідзе інтэнсіўная работа над распрацоўкай метадаў рацыянальнага выкарыстання сухіх і мокрых пясчаных глеб, падбор і чаргаванне культур у севаабаротах на гэтых глебах. Рад актуальных пытанняў распрацован і распрацоўваецца біёлагамі. Яны ўжо ўнядрылі ў практыку калгасаў некалькі метадаў барацьбы са шкоднікамі зярна, кармовай капусты і т. д. і прадаўжаюць работу як у гэтым напрамку, так і ў напрамку стварэння высокаўраджайных і ранняспелых сартоў бульбы ва ўмовах БССР, а таксама па пытанню зімастойкасці азімай пшаніцы.

Найбагацейшыя запасы торфа ставяць перад вучонымі такія пытанні, як дакладны ўчот і ацэнка тарфяных рэсурсаў БССР, механізацыя і распрацоўка новых тэхналагічных метадаў здабывання торфа, а таксама і пытанні энерга-хімічнага выкарыстання торфа. Інстытут торфа Акадэміі навук ужо распрацаваў канструкцыю трактара ХТЗ на тарфяным паліве і перадаў яе ў МТС.

Далучэнне заходніх абласцей ставіць перад вучонымі задачу высвятлення запасаў торфа і магчымасці яго выкарыстання. Перспектывы, якія дае тарфяная база, неабмежаваны. Калі ў цяперашні час вырашаюцца такія праблемы, як замена ў аўтарухавіках вадкага паліва торфам, магчымасць тазіфікацыі г. Мінска, выкарыстанне тарфяной смалы для атрымання дызельнага паліва і сінтэтычных дубіцеляў, то недалёк час, калі торф паслужыць базай і для развіцця магутнай хімічнай прамысловасці БССР. Ужо зараз такія пытанні, як атрыманне з торфа спірта, з'яўляюцца не толькі тэарэтычна, але і практычна вырашанымі.

Інтэнсіўна працуюць і вучоныя медыкі; яны ўжо далі краіне эфектыўны метад барацьбы з ваўчанкай, метад ранняга выяўлення ўнелёгачных захворванняў і прадаўжаюць работу над метадамі лячэння такіх хвароб, як лёгачны і ўнелёгачны туберкулёз. Праводзіцца барацьба з нервовымі захворваннямі і інш.

У кароткім артыкуле немагчыма колькі-небудзь падрабязна апісаць нават асноўную тэматыку Інстытутаў Акадэміі, і мы вымушаны абмежавацца кароткім пералікам асноўных напрамкаў у іх навуковай рабоце.

Навука Совецкай Беларусі ў хуткім часе будзе святкаваць свой 20-гадовы юбілей, і мы пажадаем, каб вучоныя Совецкай Беларусі з яшчэ большай энергіяй працавалі над працвітаннем нашай навукі, той навукі, якую таварыш Сталін назваў передавой і «якая не адгароджваецца ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваяванні навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добравольна, з ахвотай» (Сталін).

Віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР
акад. **С. М. Ліпатаў.**

Хімію на службу соцыялістычнаму будаўніцтву

Інстытут хіміі Акадэміі навук БССР працуе над рознастайнымі праблемамі, якія прадстаўляюць інтарэс для народнай гаспадаркі БССР. Побач з гэтым у Інстытуце вядуцца таксама работы, якія маюць сваёй мэтай далейшае развіццё хіміі як навукі. З работ, выкананых за апошнія годы, асобай увагі заслугоўваюць наступныя.

1. РАБОТА ПА ВЫДЗЯЛЕННЮ БЯЛКОЎ З НАСЕННЯ ЛУБІНА

Як вядома, у фанернай прамысловасці, шырока развітай у БССР, для клейкі фанеры ўжываўся казеін, або альбумін. Казеін атрымліваецца з малака, а альбумін з крыві, г. зн. прадуктаў дастаткова дарагіх і могучых знайсці прымяненне для іншых мэт. Ужыванне лубінавых бялкоў мае таму вялікае значэнне ў сэнсе замены харчовай сыравіны нехарчовай. Гэта работа была праведзена ў поўзаводскіх умовах і атрыманыя бялкі ўжываліся для клейкі вопытнай партыі фанеры. Выпрабаванні ўзораў фанеры, клеенай лубінавымі бялкамі, паказалі яе высокую якасць. На аснове гэтай работы будзе будавацца цэх лубінавых кляёў пры адным з фанерных заводаў БССР.

2. РАБОТА ПА ГІДРОЛІЗУ ГНІЛОЙ ДРАЎНІНЫ

У цяперашні час у СССР ёсць заводы, якія вытвараюць вінны спірт з драўляных апілак. Да гэтага часу ўжываліся толькі свежыя апілкі, якія непасрэдна атрымліваліся з дрэваапрацоўчых камбінатаў. Колькасць такіх апілак неабмежавана, а таму некаторыя з гідролізных заводаў, вытвараючы вінны спірт, не маглі працаваць на поўную магутнасць. Інстытутам хіміі (ст. навук. работнік Скрытан) праведзена работа па выкарыстанню для гэтай мэты гнілых апілак, якіх вялікая колькасць ёсць у атвалах пры лесапільных заводах. Праведзены завадскія вопыты, якія паказалі поўную магчымасць выкарыстання не толькі свежых, але і гнілых апілак для атрымання спірта.

3. АТРЫМАННЕ НОВЫХ ХІМІКА-ТЭРАПЕЎТЫЧНЫХ ПРЭПАРАТАЎ

У Інстытуце хіміі распрацован новы метад атрымання сульфідзіна, які дае выхад больш чым у 1,5 раза і перавышае выхады, атрыманыя па вядомых да гэтага часу метадах. У Інстытуце ўпершыню ў СССР атрыман новы прэпарат «альбуцыд», які ўладае высокай актыўнасцю супроць гонакокаў. Сінтэзіраван таксама арыгінальны прэпарат «сульфапірын». Даследванне прэпарата ў клініках г. Мінска паказала, што ён з'яўляецца магутным сродкам супроць менінгіта, а таксама супроць пнеўмоніі.

4. ПРЫМЯНЕННЕ МЕЛАСЫ ДЛЯ АТРЫМАННЯ АЦЭТОНА І БУЦІЛАВАГА СПІРТА

Ацэтон (растварыцель, што ўжываецца для лакаў у самалёта-будаўніцтве) і буцілавы спірт вытвараюцца зброжваннем жыта. Паколькі жыта з'яўляецца харчовай сыравінай, то Інстытут паставіў сваёй мэтай замяніць хоць-бы часткова жыта іншай нехарчовай сыравінай. У выніку праведзенай работы аказалася, што атрыманне ацэтона і буцілавага спірта можна весці на заторах, у якіх 50 проц. складае меласа—адкід цукровай вытворчасці.

5. АТРЫМАННЕ БЕНЗІНА З АДЫХОДЗЯЧЫХ ГАЗАЎ АЦЭТОНА-БУЦІЛАВАГА ЗАВОДА

Пры атрыманні ацэтона і буцілавага спірта выдзяляецца вялікая колькасць вадарода і вуглекіслаты, якія да гэтага часу выкідваліся ў паветра. У адной з работ Інстытута даказана, што з гэтых газаў можна атрымліваць сінтэтычны бензін.

У Інстытуце хіміі праводзіўся і вядзецца таксама рад іншых работ, як, напрыклад, даследванне жывіцы і яе выкарыстанне для атрымання раду каштоўных вяшчэстваў, атрыманне новых пластыфікатараў з тарфяной смалы і інш.

Дырэктар Інстытута хіміі
АН БССР **Ерафееў.**

АБ РАБОЦЕ ІНСТЫТУТА ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ ФІЗІЯЛОГІІ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Інстытут Экспериментальнай фізіялогіі асноваан у 1936 г. У 1938 г. ён быў перадан у сістэму Наркамздрава, затым у лютым 1940 г. зноў вернут у склад Акадэміі навук БССР.

Экспериментальная фізіялогія — гэта перш за ўсё тэорыя медыцыны.

Да апошняга часу Інстытут займаўся фізіялагічным даследваннем сардэчна-сасудзістай сістэмы, пытаннямі ўнутранай секрэцыі і вітамінаў, даследваннем паходжання інервацыі органаў і костнай сістэмы. Ва ўсіх гэтых напрамках Інстытут мае вельмі прыкметныя дасягненні. Адкрыта нанава «перыферычнае сэрца», тым самым недаказаная тэорыя перыферычнага сэрца набыла дакладныя эксперыментальныя абгрунтаванні (праф. І. А. Ветохін). Пытанне мае велізарнае значэнне ў клініцы пры ацэнцы сардэчна-сасудзістых з'яў.

Даказана поўная прылажымасць тэорыі парабіёза Введзенскага да сэрца і яго праводзячай узбуджэнне сістэмы (І. А. Пеймер); пытанне гэта да апошняга часу ў навуцы не было вырашана.

Знойдзены найлепшыя спосабы артэрыяльнага ўлівання крыві пры ажыўленні арганізмаў, якія знаходзяцца ў стане шока, агоніі і клінічнай смерці (І. А. Бірыла — вопытныя пераліванні крыві на фронце па людзях).

Знойдзен рассасываючыйся матэрыял для змацавання касцей пры пераломах, вывучаны спосабы яго прыгатаўлення і кансервіравання, уласцівасці яго паводзін у арганізме (д-р Школьнікаў Л. Г.).

Вывучана дзеянне вітамінізіраванага малака і вітаміна «Д» на дзяцей і некаторых сельскагаспадарчых жывёл, прыступлена да ўнядрэння спосабаў узбагачэння вітамінам «Д» малака і кармоў (д-р Форштэр, узнагароджаная за ўдзел на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы граматай).

Даказана магчымасць нармальнага росту зубнога зачатка, перанесенага ў любое месца арганізма пад скуру і незалежнасць росту ад інервацыі (праф. Герке П. Я.) і інш.

Інстытут заканчвае ў тэрмін сваю бягучую тэматыку гэтага года і выконвае тры па за-планавыя работы, якія маюць тэарэтычнае і практычнае значэнне.

У мінулым годзе супрацоўнікі Інстытута далі дзве кандыдацкія дысертацыі і адну доктарскую. У гэтым годзе рыхтуюцца дзве доктарскія дысертацыі.

Дырэктар Ін-та Эксперыментальнай фізіялогіі Акадэміі навук БССР

Праф. **Ветохін.**



У Беларускім дзяржаўным універсітэце (Мінск). Студэнты фізіка-матэматычнага факультэта на лекцыі. Фота БЕЛТА.

Узбагацім нашу соцыялістычную радзіму новымі культурамі раслін

Батанічны сад Акадэміі навук БССР працуе над вырашэннем наступных праблем: правядзенне поўнай інвентарызацыі відавога складу расліннасці БССР, стварэнне каштоўных для народнай гаспадаркі БССР культурных раслін і падбор дрэў і кустоў для зялёнага будаўніцтва БССР.

Па першай праблеме закончаны і надрукаваны работы М. П. Томіна «Определитель лишайников БССР», ч. I і II, «Определитель кустистых и листоватых лишайников СССР». А. П. Підоплічка—«Новые и редкие виды сфагнумов для БССР».

Падрыхтаваны да друку работы: А. П. Підоплічка — «Флора сфагнумов мхов БССР», А. С. Лазарэнка — «Определитель листовых мхов БССР», а групай аўтараў Батанічнага сада — «I том флоры БССР» і «Определитель лишайников БССР», ч. III.

Па другой праблеме закладзен навукова-вопытны пладовы сад на плошчы 10 га.

З мэтай палепшання народна-сартовага складу праводзяцца гібрыдызацыйныя і селекцыйныя работы з пладова-ягаднымі раслінамі.

Распрацоўваецца вопытная культура паўднёвых пладовых раслін у БССР — вінаграда, абрыкосаў, персікаў у адкрытым грунце і цытрусавых пад шклом.

Для правядзення гібрыдызацыйных і інтрадукцыйных работ Батанічны сад мае новыя вырашчаныя сарты пладовых раслін, а таксама выбраныя з сеянцаў «карынкі» Мічурына тры новыя перспектыўныя формы вінаграда: беларускі кранчаты, акадэмічны і хуткаспелы салодкі.

Гэтыя сарты адзначаюцца большай марозаўстойлівасцю і добрай якасцю пладоў.

На ўчастку вінаградніка Батанічнага сада ёсць да 500 раслін, 60 сартоў вінаграда, з якіх Батанічным садам выпрабавана ва ўмовах БССР да 20. Распрацавана агратэхніка культуры вінаграднай лазы ва ўмовах БССР і складзена ўказанне па яе разводзенню (Могучий А. В.—«Разведение винограда в условиях БССР»).

Батанічны сад, у мэтах даследчай работы, аб'ядноўвае вопытнікаў-вінаградараў розных раёнаў БССР, дае ўказанні, кіруе іх работай і забяспечвае пасадачным і чаранковым матэрыялам.

Для навуковых і папулярызацыйных работ Батанічны сад АН БССР, апрача наяўнага памалагічнага ўчастка пладова-ягадных раслін, прыступае да арганізацыі геаграфічных участкаў дрэва-хмызняковых раслін, дэкарацыйных і ўчастка юнатаў, вопытнікаў і аматараў садаводства.

Дырэктар Батанічнага сада
АН БССР **Корсакаў.**

Совецкі лад — аснова росквіту навукі і культуры

Інстытут мовы і літаратуры займаецца распрацоўкай навуковых праблем мовы і літаратуры, прычым у першую чаргу распрацоўваюцца праблемы беларускай мовы і літаратуры.

Толькі ва ўмовах совецкай улады, ва ўмовах соцыялізма, калі ўсе народы атрымалі роўнасць, нацыянальную і соцыяльную свабоду, паявіліся спецыяльныя навуковыя ўстановы, якія займаюцца беларускай мовай і літаратурай. Сярод гэтых устаноў пачэснае месца займае Інстытут мовы і літаратуры АН БССР.

Інстытут за апошнія тры годы з поспехам перамог спадчыну коснасці, кабінетнасці, інертнасці і адрыву ад актуальных задач, меўшых месца пры старым кіраўніцтве Акадэміі і Інстытута. Інстытутам напісан рад работ, маючых вялікае навуковае і грамадскае значэнне. Складзены два слоўнікі — руска-беларускі (у 2-х тамах) і яўрэйска-рускі, якія зараз знаходзяцца ў друку. Напісан і выдан падручнік для ВНУ па сінтаксісу беларускай мовы. Напісаны і зараз знаходзяцца ў друку падручнікі для ВНУ па беларускай мове (фанетыка, марфалогія, лексіка), па гісторыі беларускай літаратуры, падручнік па беларускай літаратуры для старэйшых класаў сярэдняй школы. Сабраны і выдаюцца тэксты па беларускай літаратуры XIX ст., сярод якіх ёсць рад матэрыялаў, што публікуюцца ўпершыню. У 1940 г. Інстытут працуе над нарысамі па старажытнай беларускай літаратуры, падрыхтавана ўжо да друку хрэстаматыя па старажытнай літаратуры, рыхтуецца да друку другая частка падручніка па беларускай літаратуры для сярэдняй школы. Вядзецца работа па складанню беларуска-рускага слоўніка аб'ёмам у 60 тыс. слоў, які будзе закончан у 1941 г. Разгорнута работа па вывучэнню беларускіх народных гаворак заходніх абласцей БССР. Ужо праведзены 2 экспедыцыі ў Вілейскую, Баранавіцкую і Беластоцкую вобласці і ў канцы верасня выехала трэцяя экспедыцыя ў тыя-ж вобласці. Інстытутам вядзецца работа па падрыхтоўцы паправак і змяненняў у беларускім правапісе.

Навуковыя работнікі Ін-та перыядычна выступаюць з дакладамі на прадпрыемствах, установах і ў чырвонаармейскіх часцях. Пры Інстытуце рыхтуецца аспірантура: 2 аспіранты па беларускай мове, 1 аспірант па беларускай літаратуры і 1 аспірант-дактарант па рускай літаратуры.

У 1941 г. Інстытут будзе прадаўжаць работу па вывучэнню беларускіх народных гаворак, па складанню беларуска-рускага слоўніка, будзе распрацоўваць рад праблем беларускай і рускай літаратур. Будуць напісаны манаграфіі аб класіках беларускай літаратуры Янку Купале і Якубе Коласе, аб рускім пісьменніку-класіку XVIII ст. — Крылову.

Толькі ў краіне Советаў магчыма плацатворная работа навуковых устаноў, дзе створаны ўсе магчымасці для росту навукі, самай перадавой і прагрэсіўнай — совецкай навукі.

Вучоны сакратар Інстытута Мовы і Літаратуры АН БССР

К. І. Гурскі.

Дадзім большэвіцкім калгасам навуковыя аграправілы

Інстытут біялогіі АН БССР працуе над пытаннямі, якія маюць як тэарэтычнае, так і практычнае значэнне ў галіне біялогіі і ў галіне с.-г. навук, непарыўна звязаных з будаўніцтвам соцыялістычнай гаспадаркі.

Работа інстытута вядзецца ў наступным напрамку: генетыка і селекцыя с.-г. раслін, ахова с.-г. раслін (фітапаталогія, мікрабіялогія і энтамалогія), фізіялогія раслін, фауна БССР, гельмінталогія, вывучэнне дамавых грыбоў і распрацоўка мер барацьбы з імі.

За апошнія годы з асноўных дасягненняў Інстытута трэба адзначыць атрыманне трох перспектыўных гібрыдаў бульбы, з якіх асобай увагі заслугоўвае высокаўраджайны гібрыд з сярэдне-раннім тэрмінам клубнеўтварэння, названы «Піонер». Гэты гібрыд па даных сортавыпрабавання за 1938 і 1939 гг. у калгасах заняў першае месца па ўраджайнасці, перавышаючы стандарты да 20%.

У 1940 г. гэты гібрыд перадан у дзяржаўнае сортавыпрабаванне. Пры станоўчых выніках гэтага выпрабавання гібрыд зможа выкарыстоўвацца як сорт для БССР.

Па фізіялогіі раслін вывучан уплыў мінеральных і арганічных угнаенняў на павышэнне зімастойкасці азімай пшаніцы, чырвонай канюшыны і люцэрны. Самым спрыяльным для зімастойкасці пшаніцы з'яўляецца доза фосфара 90 кг/га, калія — 60 кг/га на фоне звычайнага ўгнаення. Мінеральнае, азотнае ўгнаенне дапушчальна з восені толькі ў дозах не вышэй 30 кг/га пры абавязковай наступнай вясенняй падкормцы.

Для канюшыны і люцэрны ўстаноўлен станоўчы ўплыў вапнавання і тарфавання падзолістых глеб.

Па ахове раслін: вывучан відавы склад хваробы бульбы ў БССР, шкоднасць найбольш пашыраных з іх і распрацаваны меры барацьбы (апрысканне, прачыстка, апыльванне і т. д.).

Праведзена вывучэнне ўстойлівасці розных сартоў селекцыйнай бульбы, у рэзультаце чаго выяўлены формы, якія могуць служыць выхадным матэрыялам для далейшай селекцыйнай работы.

Напісан і выпушчан з друку «Определитель паразитных грибов на растениях-хозяевах», т. I; таксама падрыхтован да друку і другі том.

Распрацаваны мерапрыемствы па барацьбе з хваробамі с.-г. раслін для аграправіл, падабраны пратравіцелі і складзена інструкцыя па пратручванню насення крыжакветных культур (кармавой капусты). Вядзецца работа па вывучэнню хвароб коксагыза, распрацаваны меры барацьбы з ільнянымі блошкамі і ільняной ліставёрткай; вывучан відавы склад амбарных кляшчоў і распрацаваны меры барацьбы з імі. Па фауне БССР апісаны сысуны і частка грызуноў.

Перад Інстытутам біялогіі пастаўлена задача шырэй разгарнуць селекцыйную работу з мэтай распрацоўкі метадаў увядзення новых і палепшання існуючых сартоў с.-г. раслін на аснове вучэнняў Дарвіна, Тіміразева, Мічурына і Лысенка.

Калектыў работнікаў Інстытута біялогіі перабудоўвае сваю работу так, каб дапамагчы павысіць ураджайнасць нашых соцыялістычных палёў.

Дырэктар Інстытута біялогіі
АН БССР **А. А. Езубчык.**

Выданні Акадэміі навук БССР вядомы ва ўсім свеце

Пастаўленыя тав. Сталіным і нашай партыяй задачы ліквідацыі процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай яшчэ больш павялічваюць патрэбнасці шырокіх мас у кнізе.

У гэтай сувязі бібліятэка АН БССР праводзіць нямалую работу ў справе прасоўвання навуковых работ, выпускаемых выдавецтвам АН БССР.

Наша бібліятэка вядзе кнігаабмен з многімі навуковымі бібліятэкамі Совецкага Саюза і зарубежных краін. У ліку 120-ці буйных навуковых бібліятэк абменьваюцца з намі сваімі выданнямі бібліятэкі АН СССР і УССР, Дзярж. Чырванасцяжная Публічная Б-ка імені Салтыкова - Шчэдрына, б-кі філіялаў АН СССР (Армянскага, Азербайджанскага, Грузінскага, Далёкаўсходняга, Уральскага) і бібліятэкі іншых навуковых устаноў Совецкага Саюза.

У гэтым годзе наша бібліятэка разаслала 19 новых выданняў Акадэміі навук.

Звыш 40 назваў — навуковых кніг, выпушчаных выдавецтвам Акадэміі навук, атрымліваюць бібліятэкі навуковых устаноў нашых брацкіх рэспублік Совецкай Прыбалтыкі. Свабодны народ гэтых рэспублік упершыню будзе свабодна чытаць навуковыя кнігі па розных пытаннях навукі і тэхнікі Совецкай Беларусі.

Вялікую цікавасць набываюць нашы выданні ў бібліятэках зарубежных краін. У парадку міжнароднага кнігаабмена наша бібліятэка паслала вялікую колькасць выданняў Акадэміі навук у 34 буйныя навуковыя бібліятэкі заграцічных краін: НЬЮ-Йоркскую публічную бібліятэку, Бамбейскі універсітэт (Індыя), Сафійскі універсітэт (Балгарыя), у бібліятэкі Акадэмій навук Швецыі, Японіі, Юга-Славіі і інш.

Канкрэтна кіраваць работай сельскіх советаў

З дня арганізацыі сельскіх советаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі прайшло больш васьмі месяцаў. Аднак не ва ўсіх раёнах нашай вобласці правільна ацанілі іх роль і значэнне.

Да кіраўніцтва сельсоветамі прышлі сотні новых людзей, якія не былі знаёмы з структурай совецкай улады, з совецкімі законамі. Гэта людзі, якія жадаюць працаваць і патрабуюць штодзённай дапамогі і кіраўніцтва з боку совецкіх і партыйных арганізацый раёнаў.

Адсутнасць сістэматычнай дапамогі сельсоветам прывяла да раду сур'ёзных недахопаў.

4 кастрычніка ў Скідэльскім раёне адбылася нарада старшынь і сакратароў сельсоветаў. Зусім правільна ў сваіх выступленнях на нарадзе старшыня Абухоўскага сельсовета тав. Жухневіч і старшыня Глінянскага сельсовета тав. Грэцкі ўказалі, што недахопы ў рабоце маюць месца ў першую чаргу таму, што райвыканком не дапамагае ім і не вучыць іх, як трэба працаваць.

У Скідэльскім, Гродненскім і іншых раёнах да гэтага часу поўнасцю не зацверджан састаў сельскіх советаў. Члены сельсоветаў часта зменьваюцца.

Некаторыя сельсоветы зменьваюць людзей без ведама райвыканкома і райкома партыі. Так, у Верцелішскім сельсовеце (Гродненскі раён) Смольскую Н. вывелі з састава прэзідыума таму, што яна была камандыравана на кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы. У Верцелішскім, Путрыжскім, Падлінскім сельсоветах Гродненскага раёна, Абухоўскім, Жытамлянскім і іншых сельсоветах Скідэльскага раёна старшыні зменьваліся па два разы.

Паралельна з сельсоветамі да апошняга часу працягваюць існаваць сялянскія камітэты. Гэтым прыніжаецца роль членаў сельсовета.

Сельсоветы Гродненскага і Скідэльскага раёнаў на сваіх пасяджэннях зусім мала займаліся пытаннямі культурнага жыцця на вёсцы, работай школ, хат-чытален, кааперацыі і калгасамі. На большасці пасяджэнняў ставіліся справаздачы сялянскіх камітэтаў аб ходзе паставак і загатовак.

Гродненскі і Скідэльскі райкомы партыі ўзаконілі існаванне сялянскіх камітэтаў. Гродненскі райвыканком 29 жніўня на пасяджэнні прэзідыума заслухаў пытанне аб хлебапаставках і прапанаваў раду сельсоветаў заняцца пытаннямі выканання плана хлебапаставак і ачысціць сялянскія камітэты ад кулацкіх элементаў і т. д.

Да 20 верасня Скідэльскі і Гродненскі райкомы партыі ні разу не заслухоўвалі старшынь райвыканкомаў і асобных старшынь сельсоветаў аб рабоце сельсоветаў. Райвыканкомы слухалі асобныя сельсоветы толькі па пытанню паставак і загатовак.

Кіраўніцтва сельсоветамі ў гэтых раёнах заключалася ў правядзенні нарад па кампанійскіх пытаннях. Ёсць рад фактаў, калі некаторыя раённыя работнікі праяўлялі грубае адміністрыраванне да кіраўнікоў сельсоветаў, давалі ім няправільныя дырэктывы. Рашэннем прэзідыума Гродненскага райвыканкома, напрыклад, 29 ліпеня план сеназакупак даведзен да кожнага сельсовета. У Путрыжскім і Верцелішскім сельсоветах план сеназакупак давялі да кожнай вёскі, а ў вёсках — да асобнай гаспадаркі. Такія факты мелі месца і ў Скідэльскім раёне.

Дырэктывы сельсоветам у Скідэльскім і Гродненскім раёнах пісалі дырэктары маслапрома, заготсена, заготжывёлы і т. д. Усе яны патрабавалі, прапанавалі... Але мала хто дапамагаў сельсоветам і вучыў як трэба працаваць.

Сярод членаў сельсовета па сутнасці не праводзіцца арганізацыйна-масавая работа.

У Гродненскім і Скідэльскім раёнах створаны нямалы актыў інтэлігенцыі. Аднак у большасці сельсоветаў з ім не праводзіцца ніякай работы. Да апошняга часу ў большасці сельсоветаў не вядзецца ўчот рэагавання на скаргі працоўных. Па гэтаму сяляне замест таго, каб вырашыць тое або іншае пытанне па месцы, у сельсовеце,—едуць у раённы цэнтр.

Самыя будынкі ў радзе сельсоветаў як у Лаўнай, Абухове, Путрыжках і т. д., знаходзяцца ў некультурным выглядзе, нават няма вывесак. Кіраўніцтва справамі запушчана.

Сельсоветы патрабуюць сістэматычнай дапамогі і кіраўніцтва. Канкрэтнае кіраўніцтва работай сельсоветаў з'яўляецца кроўнай справай усіх райкомаў партыі і райвыканкомаў.

Е. Прусак,
інструктар абкома КП(б)Б.

Прызыў прайшоў з велізарным уздымам

Служба ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з'яўляецца пачотным абавязкам кожнага грамадзяніна СССР. Вось чаму прызыў у армію штогодна праходзіць з вялікім уздымам, як вялікае ўсенароднае свята.

Для моладзі заходніх абласцей Беларусі, вызваленай год назад, прызыў у Чырвоную Армію з'явіўся выключна знамянальнай і радаснай падзеяй. Вызваленая моладзь упершыню атрымала магчымасць пайсці ў рады доблеснай Чырвонай Арміі. Новым маладым грамадзянам вялікай краіны Советаў даверана адказная і пачотная справа — служыць у народнай арміі і ўмацоўваць абароназдольнасць нашай соцыялістычнай радзімы.

З вялікай радасцю і энтузіязмам ішлі на прызыўныя пункты маладыя рабочыя, сяляне і служачыя нашай вобласці. З нецярпеннем прызыўнікі чакалі той раднасай мінуты, калі яны акажуцца ў слаўнай пяхоце, кавалерыі, артылерыі, у танкавых і іншых часцях гераічнай Чырвонай Арміі.

Рады Чырвонай Арміі папаўняюцца новымі атрадамі байцоў, упершыню атрымаўшых магчымасць стаць пад баявыя чырвоныя сцягі.

Першы прызыў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію па нашай вобласці прайшоў з велізарным уздымам і энтузіязмам. З выключнай радасцю з'яўляліся прызыўнікі на прызыўныя пункты, дэманстрыруючы сваю арганізаванасць і адданасць партыі Леніна—Сталіна.

Ва ўсіх раёнах ад 95 да 100 процантаў прызыўнікоў з'яўляліся на пункты ў дакладна назначаныя ваенкаматамі дні і гадзіны. У большасці прызыўнікі прыходзілі на пункты арганізавана — з чырвонымі сцягамі, з кветкамі і часта з аркестрам.

Па вобласці за час прызыву не было ні аднаго выпадку нарушэння грамадскага парадку. Ні ў адным раёне не было выпадкаў праяўлення элементаў рэкрутчыны, якая так моцна існавала ў былой панскай Польшчы. У гутарках з агітатарамі, у выступленнях на мітынгах і сходах, у пісьмовых заявах прызыўнікі выказвалі сваю радасць, сваю любоў да соцыялістычнай радзімы.

— Прашу залічыць мяне ў бронятанкавую часць. Клянуся перад соцыялістычнай радзімай, што буду чэсна служыць працоўнаму народу. Ускладзеныя на мяне задачы выканаю поўнасцю і добрасумленна,—пісаў у сваёй заяве прызыўнік І. Р. Шмэр (Крынкаўскі раён). Прызыўнік гэтага раёна, калгаснік калгаса імені Стаханава С. А. Суета заяўляў:

— Я абязуюся ў радах Чырвонай Арміі служыць чэсна і самааддана. А калі патрэбна будзе, аддам сваё жыццё за любімага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Прызыўнік Летнікоўскага сельсовета, Беластоцкага раёна, тав. Песняк гаварыў:

— Я і мае бацькі да дня прызыву поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па абавязковых пастаўках. Служыць у Чырвоную Армію іду з вялікім жаданнем. Гэтага чакалі і мае бацькі.

— Мой бацька доўгія годы быў батраком, працаваў на ненавісных паноў,—расказваў прызыўнік горада Гродна тав. Раманаў.—З вялікай цяжкасцю ён пракармліваў сям'ю. Толькі з прыходам Чырвонай Арміі наша сям'я зажыла новым, радасным жыццём. Да прызыву ў Чырвоную Армію я доўга рыхтаваўся. На прызыўны пункт пайшоў з двума абароннымі значкамі. Ад бацькі-ж я атрымаў наказ—чэсна і самаадданна служыць совецкаму народу. Гэты бацькоўскі наказ я абавязуюся выканаць з чэсцю.

Такіх прыкладаў можна прывесці нямала. Усе яны гавораць аб тым, што вызваленая моладзь дастойна і чэсна выконвае свой грамадзянскі доўг перад соцыялістычнай радзімай. Маладыя рабочыя, працоўныя сяляне і інтэлігенты нашай вобласці, прызваныя ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, разам з усёй моладдзю Совецкага Саюза ў выпадку неабходнасці будуць рашуча змагацца за сваю шчаслівую радзіму, за сваё свабоднае і радаснае жыццё, за нашу большэвіцкую партыю, за вялікага Сталіна.

Прызыў закончан. Пачынаецца адпраўка першых каманд прызыўнікоў у вайсковыя часці.

А. Забалоцін,
інструктар ваеннага аддзела абкома КП(б)Б.



Стаханаўцы-двухстаночнікі 17-ай беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі комсамольцы М. Х. Мілер (злева) і Я. Ш. Паразоўскі заключаюць паміж сабой соцыялістычны дагавор. Фота А. Сапіра.

ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ XXIII-ю ГАДАВІНУ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Перадкастрычніцкае спаборніцтва чыгуначнікаў

Набліжаецца XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Работнікі Беластоцкай чыгункі гараць жаданнем яшчэ вышэй узняць прадукцыйнасць працы, паспяхова выканаць дзяржаўны план пагрузкі і ўзорна падрыхтаваць усе ўчасткі чыгункі да зімы.

Днямі лепшыя людзі дарогі звярнуліся да чыгуначнікаў з пісьмом аб разгортванні перадкастрычніцкага соцыялістычнага спаборніцтва і дастойнай сустрэчы XXIII гадавіны Кастрычніка.

«Асноўная наша ўвага, — гаворыцца ў звароце, — павінна быць накіравана на добрую падрыхтоўку ўсіх участкаў чыгункі к рабоце ў зімовых умовах, на дакладнае выкананне Ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Да наступлення зімовых халадоў павінны быць поўнасцю падрыхтаваны ўсе памяшканні, адрамантавана абсталяванне, прыведзен ва ўзорны выгляд паравозны парк. Назапасім дастатковую колькасць неабходных матэрыялаў, інструментаў і інвентару, а самае галоўнае — падрыхтуем да перамаганняў зімовых цяжкасцей нашы кадры».

Сотні і тысячы чыгуначнікаў Беластока горача падхапілі гэты заклік і з кожным днём усё шырэй разгортваюць масавае перадсвяточнае спаборніцтва. Удзельнікі спаборніцтва стаханаўска-крываносаўскімі справамі адказваюць на зварот.

За ўвесь час існавання паравознага дэпо Гродна не было выпадку, каб паравоз з прамывачнага рамонту выходзіў раней, чым праз 48 гадзін. Тут існавала думка, што пры маючымся незакончаным абсталяванні, недахопе запасных часцей хутчэй нельга выпусціць лакаматыў з прамывачнага рамонту. Днямі комсамольска - маладзёжная комплексная брыгада пад кіраўніцтвам тав. Харытонава адрамантавала лакаматыў № 37, які меў вялікі аб'ём рамонту, за 8 гадзін пры норме ў 46 гадзін.

Узоры соцыялістычнай працы пры ўстанаўленні гэтага выдатнага рэкорда паказалі сакратар камітэта ВЛКСМ інжынер тав. Амельчанка, машыніст-інструктар тав. Шляхін, машыністы тт. Фралоў, Студзенікін і Аляксееў, малады токар тав. Журневіч, газазваршчык тав. Зайка і іншыя.

Нядаўна дзяжурныя па Ваўкавыскаму аддзяленню тт. Ефімцаў, Катляроў і дыспетчар другога круга тав. Радзіонаў дабіліся новага вытворчага поспеху. Яны добра арганізавалі пропуск паяздоў на ўчастку, значна палепшыўшы выкананне графіка і абарот вагона. Так, поезд № 919, які ішоў па соцыялістычнай пуцёўцы, стаяў на станцыі Ваўкавыск усяго 15 мінут, тады як на гэта адведзена больш гадзіны. У гэты дзень на Брэст - Літоўскую чыгунку было здана дзевяць паяздоў, восем з іх— па рэгуліровачнаму заданню. Канкрэтную і аператыўную дапамогу лінейным работнікам аказалі дзяжурныя па ўпраўленню чыгункі тт. Карэеў і Звераў. Яны дабіліся таго, што сутачнае заданне па пагрузцы грузаў першай катэгорыі было выканана чыгункай на 120 процантаў, па выгрузцы — на 115 процантаў.

Брыгада старшага аглядчыка вагонаў тав. Васільева (ст. Беласток—Цэнтральны) праяўляе комуністычныя адносіны да працы. Робячы перазапраўку буксаў, брыгада тав. Васільева з дня ў дзень павышае прадукцыйнасць працы. Калі ў верасні яна за змену перазапраўляла буксы у 6—7 вагонах, то, пачынаючы з 6 кастрычніка, брыгада штодзённа перазапраўляе буксы не менш, чым у 10-12 вагонаў. Слесары-стаханаўцы брыгады тав. Далкоўскі і Руткоўскі даюць за змену паўтары—дзве нормы. Добра працуе і станцыённая змазчыца тав. Мольская.

На будаўнічай пляцоўцы ст. Чырвоны Бор працуе нямала рабочых, якія зусім нядаўна прышлі з вёсак на чыгуначны транспарт. Учарашнія сяляне, якія ўсяго год таму назад далучыліся да соцыялістычнага будаўніцтва, працуюць чэсна і добрасумленна. Узяць, напрыклад, брыгаду землякопаў, якой кіруе тав. Брулінскі. Замест 6 кубаметраў па норме, яна штодзённа дае 12—14 кубаметраў. Спаборнічаючая з ёй брыгада тав. Жэброўскага вытворчае заданне выконвае на 200—230 процантаў.

8 кастрычніка газазваршчык паравознага дэпо Беласток тав. Мацэйка выканаў вытворчае заданне на 449 процантаў. Токар-стаханавец механічнага цэха тав. Рамаеўскі даў за змену дзве з палавай нормы.

Выдатны рэкорд прадукцыйнасці працы ўстанавіў у ноч з 8 на 9 кастрычніка стругальшчык - многастаночнік тав. Чумакоў. Абслугоўваючы аднычасова два станкі, ён выканаў зменнае заданне на 800 процантаў.

Такія першыя вынікі перадкастрычніцкага спаборніцтва чыгуначнікаў Беластоцкай чыгункі.

А. Кандрацьеў.

СПАБОРНІЦТВА Ў КАЛГАСЕ

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Дзейсна рытуюцца да свята калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 22 гадавіны РСЧА. Амаль па ўсіх відах загатовак калгас разлічыўся ўжо з дзяржавай. Шырока разгортваецца перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Стаханаўскія ўзоры работы паказваюць Іван Лубоўскі, Сава і Ефрасіння Хацук. Яны штодзённа выконваюць па паўтары—дзве нормы.

Добрыя ўзоры работы паказваюць комсамольцы і несаюзная моладзь калгаса. Комсамолец Аляксей Ліда, маладая калгасніца Анна Лубоўская на ўборцы бульбы выконваюць норму на 200 і больш процантаў.

Рыгор Шырма і яго ансамбль

Напярэдадні юбілейнага канцэрта 2 сакавіка 1939 года Рыгора Шырму выклікаў намеснік віленскага ваяводы пан Ясінскі.

— Для чэго па-польску не спеваш? — колка кінуў ён насустрач увайшоўшаму. Але ўбачыўшы, што крыкам нічога не даб'ешся, змяніў тон.

— Няхай пан прадасць нам сабраныя песні. Мы пераікладзем іх па-польску.

Гэта было горш за катаванне. Ледзь стрымліваючы абурэнне, Рыгор Шырма адказаў:

— Паспрабуйце афарбаваць гэты вышыты абрус у жоўты колер — атрымаецца паскудства. Тое-ж і з народнымі песнямі.

Публічны юбілейны канцэрт забаранілі. Яго правялі поўлегальна ў будынку ўніверсітэта. На канцэрце прысутнічалі прыехаўшыя за некалькі кілометраў сяляне-беларусы. Яны прагна слухалі роднае слова, глядзелі танцы.

Гэта быў апошні канцэрт. Самадзейны беларускі хор, які на працягу пятнаццаці год існаваў пад кіраваннем Рыгора Шырмы, разагналі.

Цяперашні кіраўнік беларускага ансамбля песні і пляскі Рыгор Раманавіч Шырма праводзіў вялікую работу ў змрочныя годы белапольскай акупацыі. Азіраючыся па баках, каб не трапіць на вочы шпіцлю, ці паліцэйскаму, Шырма хадзіў з адной вёскі ў другую і збіраў залатыя россыпы беларускай народнай творчасці. Ён сабраў багацейшыя фальклорныя матэрыялы, у якіх падняволны народ выказваў свае надзеі і чаканні, свае пачуцці і думкі.

Польскі ўрад, праводзячы палітыку гвалтоўнай паланізацыі, бязлітасна душыў беларускую культуру. Як агня, баяўся ён народнага мастацтва. Але яго нельга было пасадзіць у турму, нельга было ліквідаваць. Яно крыніцай біла з народных нізоў, расло і развівалася.

На кватэры Шырмы збіраліся студэнты і беспрацоўныя — палкія аматары народнага мастацтва. Тут-жа рэпетыравалі і «выступалі». Публічныя канцэрты дазваляліся толькі два разы ў год, ды і то спяваць на іх прыходзілася ў поўгаласу. Песні Янкі Купалы і Якуба Коласа былі забаронены. Лепшыя народныя спевы выкрэсліваліся з праграм канцэртаў.

Многія ўдзельнікі хора ды і сам Шырма былі беспрацоўнымі. Цяперашні балетмейстар ансамбля Іван Хворост — чалавек з вышэйшай адукацыяй — пасля доўгіх год беспрацоўя дабіўся, нарэшце, пасады касіра на гарадскім катку. Сядзіць, бывала, у білетнай будцы і просіць марозу. Зіма нібы знарок выдалася цёплая, і каток часта пуставаў. Саліст хора Савіцкі працаваў чорнарабочым на каналізацыі.

Рыгор Шырма любоўна расціў кадры беларускага мастацтва. Ён-жа на грошы, сабраныя сярод сялян і беларускай інтэлігенцыі, выдаў зборнік вершаў Максіма Танка «На этапах». У зборніку змешчаны вершы, поўныя рэволюцыйнага пафасу, веры ў скорае з'еднанне з усходнімі братамі. Кніга была канфіскавана. Паэта пасадзілі ў турму, а выдаўца пацягнулі ў паліцэйскі ўчастак.

Гераічная Чырвоная Армія вызваліла заходне-беларускія прасторы ад панскага бота. Адкрылася новая сонечная старонка ў развіцці беларускага мастацтва.

З якой энергіяй, з якім энтузіязмам узяўся Р. Шырма за даручаную яму любімую справу — на вольнай совецкай зямлі арганізаваць ансамбль беларускай песні і пляскі! Ён адразу-ж накіраваўся ў вёскі, дзе некалі збіраў фальклор, слухаў мілагучныя спевы хлапцоў і дзяўчат, легенды сівых дзядоў. Ён адбіраў спевакоў для ансамбля. У лютым месяцы мінулага года малады калектыў пачаў сваю працу.

З першых дзён ансамбль становіцца любімым госцем у рабочых, вясковых і чырвонаармейскіх аудыторыях. Ён актыўна ўключаецца ў кампанію па выбарах дэпутатаў Вярхоўных Советаў СССР і БССР, едзе ў раёны сваёй вобласці.

Незабыўнае ўражанне асталося ва ўсіх удзельнікаў ансамбля ад сваёй паездкі ў Мінск, дзе яны былі горача сустрэты грамадскасцю сталіцы, з поспехам выступалі перад дэлегатамі XVIII з'езда КП(б)Б.

У лічаныя месяцы, дзякуючы нястомнай, невычарпальнай энергіі і працавітасці, адданасці і любві да сваёй справы арганізатара і кіраўніка ансамбля тав. Шырмы і яго памочнікаў — балетмейстара І. М. Хвораста і педагога танцаў А. Н. Рэйзер, ансамбль стварае багаты, разнастайны па сваёй жанравай яркасці, па мастацкаму майстэрству, рэпертуар.

Слухаючы канцэрт ансамбля, проста дзіву даешся, як у такі кароткі час толькі што народжаны калектыў дасягнуў мастацкай гарманічнасці, набыў лепшыя рысы прафесіянальнага майстэрства. Беларускія, рускія, польскія песні і танцы. Старыя і сучасныя. І колькі ў іх сапраўды смелага творчага размаху, ініцыятывы, арыгінальнасці і выдумкі! Самае лепшае, што ў гэтым калектыве баяцца руціннай «самабытнасці», малейшай прымітывізацыі народнай творчасці, стараючыся перадаць кожны танец, кожную песню ва ўсёй іх чаруючай прыгожасці, мастацкай яркасці. Колькі разоў у нас ставіліся рознымі знаўцамі і «Лявоніха» і «Юрачка» і «Крыжачок» і «Падушачкі», аднак мы яшчэ не бачылі беларускага народнага танца ў такім поўным мастацкім выяўленні, як у беластоцкім ансамблі. Тое-ж і са спевамі. Невычарпальнае багацце народных мелодый, тэкстаў астаецца невядомым нашаму слухачу. Дапытлівы, нястомны збіральнік лепшых узораў фальклора Рыгор Шырма навучае свой калектыў пастаяннаму творчаму нездавальненню дасягнутым, няспынным пошукам усё новых і новых магчымасцей, узбагачаючых мастацтва.

Побач з запасам народных песень ансамбль пашырае свой рэпертуар за лік лепшых твораў класічнага і сучаснага вялікага рускага мастацтва (хоры оперы «Дэман», творы кампазітараў Александрава, Дунаеўскага і іншых). Цяпер калектыў рыхтуе ўрыўкі з выдатнай беларускай оперы «Кветка шчасця» Туранкова, развучвае лепшыя польскія народныя песні і танцы.

Шчырыя сімпатыі, сардэчную ўвагу заваяваў жыццерадасны таленавіты калектыў у шырокай совецкай грамадскасці. Але ніяк не можа дабіцца ён гэтай увагі ў абласнога аддзела мастацтваў. Мы ўжо не будзем гаварыць пра нядаўняе мінулае, калі ансамблю свядома ставілі палкі ў калёсы, па-хамску адносіліся да яго кіраўнікоў, да артыстаў—месяцамі не выплачвалі зарплаты, не давалі памяшкання для заняткаў, і калектыў быў вымушан весці свае рэпетыцыі ў курыльным пакоі гарадскога тэатра. Толькі ўмяшанне абкома партыі рашуча змяніла адносіны да ансамбля. Аднак і па сёння асталіся рэшткі безуважлівасці і гандлярскага падыходу аддзела мастацтваў і абласной філармоніі да ансамбля. І па сёння ансамбль не мае сталага свайго памяшкання, і па сёння яго артысты знаходзяцца ў немагчымых жыллёвых умовах. У самым калектыве адсутнічае ідэйна-выхаваўчая работа, не вядзецца агульна-адукацыйнай вучобы.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР выказвае сваю ўвагу да ансамбля пакуль што аднымі прыгожымі загадамі, не клапоцячыся аб іх ажыццяўленні.

Творчасць маладога калектыва, яго мастацкае значэнне заслугоўваюць самай шырокай папулярызацыі. Час падумаць аб тым, каб пазнаёміць з яго выступленнямі, з яго творчасцю грамадскасць усіх культурных цэнтраў Совецкай Беларусі.

Ц. Крысько.
Т. Лясовіч.



Старшыня Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР Міхась Лынькоў віншуе з прыняццем у члены Саюза совецкіх пісьменнікаў беларускага паэта Анатолія Іверса. Фота А. Сапіра.

Да падпісання пагаднення паміж СССР і Фінляндыяй аб дэмілітарызацыі і неўзбраенні Аландскіх астравоў

11 кастрычніка ў Маскве падпісана Пагадненне паміж СССР і Фінляндыяй аб Аландскіх астравах.

З совецкай стараны Пагадненне падпісаў Народны Камісар Замежных Спраў тав. Молатаў В. М. і з Фінляндскай стараны — Пасланнік Фінляндыі ў Маскве п. Паасківі Ю. К.

Тэкст пагаднення прыводзіцца ніжэй.

* * *

ПАГАДНЕННЕ СССР І ФІНЛЯНДЫІ АБ АЛАНДСКІХ АСТРАВАХ

Урад СССР, з аднаго боку, і Урад Фінляндскай Рэспублікі, з другога боку, натхнёныя жаданнем умацаваць асновы сваёй безапаснасці і міру на Балтыйскім моры, прызналі неабходным заключыць паміж сабой ніжэйнаступнае Пагадненне і для гэтага назначылі сваімі ўпаўнаважанымі:

Урад Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік:

Старшыню Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў Вячэслава Міхайлавіча **МОЛАТАВА;**

Урад Фінляндскай Рэспублікі Надзвычайнага Пасланніка Фінляндыі ў Маскве і Паўнамоцнага Міністра Юхо Кусці **ПААСІКІВІ,**

якія ўпаўнаважаныя, па прад'яўленні сваіх паўнамоцтваў, прызнаных складзенымі ў належнай форме і ў поўным парадку, згадзіліся аб ніжэйнаступным:

АРТЫКУЛ 1.

Фінляндыя абавязуецца дэмілітарызаваць Аландскія астравы, не ўмацоўваць іх і не прадастаўляць іх для ўзброеных сіл іншых дзяржаў.

Гэта азначае таксама, што ніякая ўстанова ці аперацыйная база, ваенная або марская, ніякая ўстанова ці аперацыйная база ваеннай авіяцыі, ніякае іншае ўстройства, якое можа быць выкарыстана ў ваенных мэтах, не можа быць захавана ці стварацца ў зоне Аландскіх астравоў, як Фінляндыяй, так і іншымі дзяржавамі, а існуючыя на астравах фундаменты для ўстаноўкі артылерыі павінны быць зрыты.

АРТЫКУЛ 2.

Пад назвай «зона Аландскіх астравоў» у гэтым Пагадненні падразумяваюцца ўсе астравы, астраўкі, шхеры і скалы, размешчаныя ў воднай прасторы, якая абмяжоўваецца наступнымі лініямі:

а) на поўначы паралеллю паўночнай шыраты 60°41',

б) на ўсходзе прамымі лініямі, якія злучаюць паслядоўна наступныя геаграфічныя пункты:

1)	60°41;0 паўн. шыр. і	21°00',0	усходн. даўж. ад Грынвіча
2)	60°35;9 „ „ „	21°06',9	„ „ „ „
3)	60°33;3 „ „ „	21°08',6	„ „ „ „
4)	60°15',8 „ „ „	21°05',5	„ „ „ „
5)	60°11',4 „ „ „	21°00',4	„ „ „ „
6)	60°09',4 „ „ „	21°01',2	„ „ „ „
7)	60°05',5 „ „ „	21°04',3	„ „ „ „
8)	60°01',1 „ „ „	21°11',3	„ „ „ „
9)	59°59',0 „ „ „	21°08',3	„ „ „ „
10)	59°53',0 „ „ „	21°20',0	„ „ „ „
11)	59°48',5 „ „ „	21°20',0	„ „ „ „
12)	59°27',0 „ „ „	20°46',3	„ „ „ „

в) на поўдні паралеллю паўночнай шыраты 59°27',

г) на захадзе прамымі лініямі, якія злучаюць паслядоўна наступныя геаграфічныя пункты:

13)	59°27',0 паўн. шыр. і	20°09',7	усход. даўж. ад Грынвіча
14)	59°47',8 „ „ „	19°40',0	„ „ „ „
15)	60°11',8 „ „ „	19°05',5	„ „ „ „
16)	Сярэдзіна скалы Меркет		
	60°18',4 „ „ „	19°08',5	„ „ „ „
17)	60°41',0 „ „ „	19°14',4	„ „ „ „

Тэрытарыяльныя воды Аландскіх астравоў лічацца прасціраючыміся ў час адліву на адлегласці ў тры марскіх мілі ад астравоў, астраўкоў і скал, якія не знаходзяцца пастаянна пад вадой, размежаваных вышэй.

АРТЫКУЛ 3.

Совецкаму Саюзу прадастаўляецца права ўтрымліваць на Аландскіх астравах сваё Консульства, у кампетэнцыю якога, апрача звычайных консульскіх функцый, уваходзіць праверка правядзення ў жыццё абавязацельстваў па артыкулу 1-му данага Пагаднення аб дэмілітарызацыі і неўмацаванні Аландскіх астравоў.

У тых выпадках, калі консульскі прадстаўнік СССР установіць акалічнасці, якія па яго думцы знаходзяцца ў супярэчнасці з маючыміся ў даным Пагадненні пастановамі аб дэмілітарызацыі і неўмацаванні Аландскіх астравоў, ён мае права зрабіць праз упраўленне ландсгеўдынга Аландскага Лена, фінляндскім уладам заяву аб правядзенні сумеснага расследвання.

Гэта расследванне праводзіцца консульскім прадстаўніком СССР і Упаўнаважаным урада Фінляндыі ў самым тэрміновым парадку.

Рэзультаты сумеснага расследвання фіксіруюцца ў пратаколе, складзеным у чатырох экземплярах, на рускай і фінскай мовах і паведамляюцца, для прыняцця неабходных мер, урадам абодвух Дагаварваючыхся Старон.

АРТЫКУЛ 4.

Данае Пагадненне ўступае ў сілу неадкладна па яго падпісанні і падлягае наступнай ратыфікацыі.

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі будзе зроблен у гор. Хельсінкі ў дзесяцідзённы тэрмін.

Складзена ў двух арыгіналах, кожны на рускай і фінскай мовах у гор. Маскве 11 кастрычніка 1940 года.

В. МОЛАТАЎ. **Ю. К. ПААСІКІВІ.**

Забойства мэра Шанхая

ШАНХАЙ, 11 кастрычніка. (ТАСС). Сёння раніцай у сваёй рэзідэнцыі, размешчанай побач з штабам японскай жандармерыі, у раёне Хонк'ю, забіт мэр Вялікага Шанхая Фу Сяо-ань.

НЬЮ-ЁРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Шанхайскі карэспандэнт Асошыэйтэд Прэс, паведамляючы аб забойстве Фу Сяо-аня, указвае, што, па думцы іншаземцаў, японцы захопяць міжнародны сетльмент пад прадлогам «аднаўлення парадку».

Карэспандэнт далей паведамляе, што «японскія войскі пераўтварылі ўвесь раён Хонк'ю ва ўзброены лагер. Вуліцы забарыкадыраваны».

Карэспандэнт указвае, што гэтыя мерапрыемствы праведзены ў сувязі з забойствам Фу Сяо-аня.

ТОКІО, 11 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін перадае падрабязнасці забойства Фу Сяо-аня. Забойца карыстаўся кінжалам ці нажом. У Фу Сяо-аня былі перарэзаны артэрыі горла. Акрамя таго, яму нанесена была глыбокая рана.

Рэзідэнцыя Фу Сяо-аня знаходзіцца ў параўнаўча нешматлюдным раёне Хонк'ю. Дом Фу Сяо-аня ўдзень і ноччу ўзмоцнена ахоўваюць звыш 20 спецыяльна абучаных паліцэйскіх. Раён Хонк'ю складае частку міжнароднага сетльмента. Гэта частка сетльмента ператорана ва ўзброены лагер. Японскія паліцэйскія патруліруюць вакол дома Фу Сяо-аня. Усе ўваходы ў Хонк'ю з іншых раёнаў сетльмента ўзмоцнена ахоўваюцца і ўсе прахожыя падвяргаюцца вобыску.

НЬЮ-ЁРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Шанхайскі карэспандэнт газеты «Нью-Ёрк таймс» паведамляе, што ў сувязі з забойствам Фу Сяо-аня японцы ўвялі ваеннае становішча ў занятых імі раёнах на поўнач ад Сучжоускага канала. У гэтым сектары японцы пачалі вобыскі ў дамах. Раніцай 11 кастрычніка японцы перасеклі Сучжоускі канал па мастах, якія вядуць у міжнародны сетльмент.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «Галоўны ўдар германскай авіяцыі ўчора быў накіраван супроць Лондана. Адзначаны шматлікія ўзрывы і пажары. Германскія бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы на шматлікія ваенныя аб'екты Ліверпуля, Біркенхеда, Манчэсцера. У паўднёвай і сярэдняй Англіі паспяхова бамбардыраваны партовыя пабудовы, ваенныя прадпрыемствы, базы снабжэння. Бамбардыраваны аэрадромы на заходнім і паўднёвым узбярэжжы Англіі. Зруйнаваны ангары і сховішчы.

Марская артылерыя абстраляла Дуўр. Адзначаны пападанні ў судны і іншыя важныя аб'екты.

У заходняй і паўночна-заходняй Германіі англійскія самалёты атакавалі розныя гарады і прамысловыя пабудовы. Аб'екты ваенна-гаспадарчага значэння не пацярпелі. Зруйнавана некалькі жылых дамоў.

Страты непрыяцеля ўчора склалі 12 самалётаў. 4 германскія самалёты не вярнуліся на свае базы».

—0—

Дзеянні англійскай авіяцыі

ЛОНДАН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі паведамляе, што з наступленнем цемнаты 10 кастрычніка буйныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў накіраваліся ў Германію праз Паўночнае мора. Каля 8 гадзін вечара на докі Вільгельмсгафена былі скінуты бомбы буйнага калібра. Гэты налёт працягваўся каля двух гадзін. Англійскія бамбардыроўшчыкі былі сустрэты ўзмоцненым агнём зенітнай артылерыі, што прымусіла самалёт мяняць вышыню. Адначасова з налётам на Вільгельмсгафен быў зроблен налёт на другі порт, які мае вялікае стратэгічнае значэнне. Тут англійская авіяцыя таксама была сустрэта інтэнсіўным агнём зенітнай артылерыі. Не гледзячы на гэта, было скінута многа бомб, у рэзультаце чаго ўзніклі два буйных пажары, зарава якіх было відаць з мора на адлегласці 70 міль.

ЛОНДАН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае англійскае міністэрства авіяцыі, буйныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёты на нафтасховішчы непрыяцеля ў ноч на 10 кастрычніка. У рэзультаце бамбардыроўкі ў Гамбургу адбыўся ўзрыў нафтавых рэзервуараў і ўзніклі пажары на нафтасховішчах у Гановеры, Рэйхсгольцы, Гельзенкірхене, Кёльне і Магдэбургу. У Кіле жорсткай бамбардыроўцы былі падвергнуты буйныя верфі. У доках Кіля ўзніклі пажары. У портах Кале, Булоні, Гаўра і Брэста былі атакаваны розныя судны. У Шэрбургу падвергліся бамбардыроўцы батарэі берагавой абароны. Іншыя злучэнні англійскіх самалётаў атакавалі судны ў Флісінгене і Амстэрдаме, а таксама докі ў Гельдэры. Бамбардыроўцы падвергліся таксама авіяцыйныя заводы «Фокер» у Амстэрдаме, заводы ў Ботроце і доменная печ у Оберзаўгене.



Культурна і весела праводзяць свой адпачынак у ленінскім кутку рабочыя 32-й беластоцкай ваціна-ватнай фабрыкі. Ля раяля ўчотчыца ткацкага цэха Ф. А. Тапчэўская.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА.

Дапамога многадзетным мацерам

Днямі ўпершыню ў Ломжынскім раёне старшынёй раённага выканаўчага камітэта тав. Данілавым была ўручана дзяржаўная грашовая дапамога тром многадзетным мацерам. Дапамогу па многадзетнасці па 2.000 рублёў кожная атрымалі М. С. Верніцкая (вёска Заруза), А. Ю. Нацюркоўская (вёска Падоса, Мястскоўскага сельсовета) і Е. А. Куржава (вёска Мясткова).

М. С. Верніцкая, А. Ю. Нацюркоўская, Е. А. Куржава ад усяго сэрца шчыра дзякавалі партыю і урад за аказаную дапамогу і клопаты аб іх.

На бліжэйшым пасяджэнні прэзідыума райвыканкома будзе разглядацца пытанне аб аказанні дапамогі яшчэ 6 многадзетным мацерам па 2.000 і 4.000 рублёў кожнай.

П. Паўлаў.

Беласток—сталая база Польскага тэатра

Польскі драматычны тэатр БССР пад кіраўніцтвам тав. Венгерка да гэтага часу меў сваю сталую базу ў Гродне.

Згодна рашэння Упраўлення па справах мастацтваў пры Соўнаркоме БССР, тэатр будзе пастаянна працаваць у Беластоку, дзе яму прадастаўляецца памяшканне гарадскога тэатра.

Калектыў тэатра рыхтуе зараз дзве новыя пастаноўкі: «Аптымістычную трагедыю» совецкага пісьменніка Вішнеўскага і «Вяселле Фігаро» Бомаршэ.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ 24-й ФАБРЫКІ

На 24-й беластоцкай фабрыцы праводзіцца вялікая рэканструкцыйная работа. Замест пяці корпусаў, у якіх была размешчана вытворчасць, увесь вытворчы апарат сканцэнтрыраван у двух вялікіх адрамантаваных будынках. Гэта дасць магчымасць скараціць выдаткі на паліва.

К 23 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі пры фабрыцы будуць адкрыты дзіцячы сад і яслі.

АБАРОННАЯ РАБОТА

Днямі ў Скідэлі адбыўся выпуск 48 значкістаў «Гатоў да санітарнай абароны» першай ступені. Усе значкісты здалі іспыты на «выдатна». Частка з іх у канцы гэтага месяца будзе арганізавана ў санітарныя пасты па прадпрыемствах раёна.

Салдаценкава,
старшыня Скідэльскага аргбюро Чырвонага Крыжа.

ШКОЛА ДЛЯ ГЛУХАНЯМЫХ ДЗЯЦЕЙ У ЛОМЖЫ

У Ломжы, у памяшканні былога манастыра, адкрылася першая на тэрыторыі нашай вобласці школа для глуханямых дзяцей.

Новая школа разлічана на 60 вучняў. Яна забяспечана кадрамі настаўнікаў-спецыялістаў. Зараз праходзіць прыём вучняў.

ЗА ЎЗОРНУЮ ЧЫСТАТУ Ў ЦЫРУЛЬНЯХ

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У беластоцкіх цырульнях не звяртаюць належнай увагі на чыстату і гігіену. Кістачкі пасля карыстання не стэрылізуюцца, майстры, пабрыўшы аднаго кліента, не памыўшы рук, прыступаюць да брыцця другога. Інструменты часта прамываюцца ў халоднай вадзе, і ніхто не цікавіцца афярамі антысанітарыі, якія захварэлі экземай.

Санітарная інспекцыя павінна неадкладна зацікавіцца пытаннямі гігіены ў цырульнях Беластока, а Чырвоны Крыж павінен наладзіць стэрылізацыю кістачак і іншых цырульных прылад.

Ваенурач Жагаль.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

ВЫПІСКА З ПАСТАНОВЫ № 30

БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ад 10 кастрычніка 1940 года.

Аб правядзенні падатковага ўчоту плацельшчыкаў і аб'ектаў абкладання па дзяржаўных і мясцовых гарадскіх падатках на 1941 год.

У адпаведнасці з загадам НКФ СССР ад 4 верасня 1940 года за № 656|110 і пастановай абласнога выканаўчага камітэта ад 4 кастрычніка гэтага года аб правядзенні падатковага ўчоту плацельшчыкаў і аб'ектаў абкладання па дзяржаўных і мясцовых гарадскіх падатках на 1941 год, Беластоцкі гарадскі выканаўчы камітэт пастанаўляе:

1. Правесці з 15 кастрычніка 1940 года па 15 студзеня 1941 года па гораду Беластоку падатковы ўчот грамадзян, якія маюць самастойныя крыніцы даходу ад заняткаў гандлем, прамысловай дзейнасцю, ад заняткаў саматужна-рамесленым промыслам, ад здачы ў наймы пабудоў, а таксама грамадзян, якія маюць зямельныя ўчасткі, будынкі, рабочую і прадукцыйную жывёлу.

2. Абавязаць упраўляючых дамамі і домаўладальнікаў запоўніць картачкі падатковага ўчоту і здаць такія да 13 лістапада гэтага года ва ўстаноўленыя данай пастановай прыёмныя пункты.

3. У мэтах найбольш чоткага абслугоўвання домаўладальнікаў пры здачы запоўненых картачак падатковага ўчоту арганізаваць 10 прыёмных пунктаў.

1-шы прыёмны пункт: Жаўткоўскае шасэ, дом № 12 (Клуб чыгуначнікаў).

2-гі прыёмны пункт: вул. Герцэна, дом № 3 (Клуб шарсцянікаў).

3-ці прыёмны пункт: Юравецкая вул., дом № 14 (Клуб 17-ай фабрыкі).

4-ы прыёмны пункт: Чырвонаармейская вул., дом № 21 (гарадскі фінансавы аддзел), пакой 35.

5-ы прыёмны пункт: вул. Кірава, дом № 8 (Горпромкамбінат).

6-ы прыёмны пункт: Окцябрская вул., дом № 23 (2-ое паштовае аддзяленне).

7-ы прыёмны пункт: Совецкая вул., дом № 105 (Горжылупраўленне).

8-ы прыёмны пункт: вул. Чэлюскіна, дом № 19 (Чырвоны куток арцелі „Аб'яднанне").

9-ы прыёмны пункт: Авіяцыйная вул., дом № 21 (Чырвоны куток 2-га скуркамбіната).

10-ы прыёмны пункт: вул. Міцкевіча, дом № 15 (Клуб 6-га камбіната).

4. Устанавіць час работы прыёмных пунктаў з 9 да 15 гадзін і з 17 гадзін 30 мінут да 19 гадзін 30 мінут.

5. За непадачу і нясвоечасовую здачу картачак падатковага ўчоту вінаватыя будуць падвяргацца штрафу да 100 рублёў. За падачу ў картачках падатковага ўчоту заведама няправільных звестак вінаватыя падвяргаюцца крымінальнай адказнасці.

Старшыня Беластоцкага Горвыканкома **І. РАЖНОЎСКІ.**

Сакратар Беластоцкага Горвыканкома **Ф. ОКУНЬ.**

УБ. — 69.

Друкарня Беластокдруку.